Мікалай Пратасеня

педагог дадатковай адукацыі ДУДА «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна», (г. Салігорск, Беларусь)

# Мастацтва народнай керамікі як аснова адукацыйна-творчага працэсу ў студыі «Скарбонка»

*З глыбіні стагоддзяў гучыць магічны свіст глінянай цацкі-свістулькі, ганчарнае кола нарэзвае кругі з сівой даўніны ў сённяшні час. Маленькі хлопчык, удзяўшы ў рукі кавалачак гліны, якую дала яму маці-зямля, хоча зрабіць такую ж цацку-свістульку, з якою гуляў яго аднагодак тысячы гадоў назад, каб адчуць вялікую сілу няспыннага жыцця, спасцігнуць яе глыбокую таямніцу.*

У г. Салігорск на працягу 30 гадоў у студыі «Скарбонка» цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна дарослыя і дзеці ствараюць гліняныя цацкі. Стыльныя, вобразныя конікі, козлікі, пеўнікі звонкім свістам, як і цацкі-бразготкі з таямнічым гукам, поўняць сцены студыі, гучаць у горадзе, кватэрах, на кірмашах і фестывалях, працягваючы сувязь стагоддзяў і пакаленняў. Мастацтва глінянай цацкі, амаль забытае, не запатрабаванае ва ўмовах сучасных сацыяльна-эканамічных стасункаў, усё ж працягвае жыць як дзіцячая забаўка, сувенірная пластыка, як твор мастацтва, далёка ў мінулым пакінуўшы сваё культавае прызначэнне.



Яшчэ ў сярэдзіне XX ст. на вуліцы можна было сустрэць павозку анучніка альбо ганчара і прыдбаць, выменяць за курынае яйка цацку-свістульку. І колькі было ў дзяцей радасці свісцець і гуляць з гліняным цудам — пеўнікам-свістком. А з надыходам вясны бабуля рабіла з намі птушак: з гліны альбо глею ляпіла тулава птушкі, з бярозавага веніка выломвала некалькі галінак, утыкала іх у сырую гліну, дзе размяшчаліся крылы і хвост.

Пасля навучання на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта я прыйшоў працаваць кіраўніком гуртка ў Салігорскі Дом піянераў (цяпер — цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна), каб навучыць дзяцей ляпіць цацкі.

З глінянай цацкі ў студыі «Скарбонка» пачалося вывучэнне і адраджэнне народнага мастацтва, гэта стала галоўным кірункам творчай дзейнасці. Экскурсіі ў краязнаўчыя музеі, музеі народнага мастацтва, экспедыцыі ў ганчарныя цэнтры, сустрэчы з майстрамі, навуковая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратура аб народным мастацтве, наведванне выстаў далі аснову і напрамак вучэбнай і творчай дзейнасці ў студыі. Першымі навуковымі дапаможнікамі па стварэнню цацкі сталі кнігі Я. М. Сахуты «Фарбы роднай зямлі», «Беларуская народная кераміка», М. Ржавуцкага «Беларуская гліняная цацка» і асабістая сустрэча з майстрам.

Я зрабіў некалькі копій цацак розных майстроў. Найбольш спадабаліся цацкі Сцяпана Глебкі сваёй стылістычнай цэльнасцю, абагульненай вобразнасцю, якія далі аснову для стварэння маёй цацкі-свістулькі. Яе характарызуе цэльнасць канструкцыі, абагульненасць пластычнай трактоўкі вобраза, стрыманасць дэкаратыўнай аздобы — каляровая паліва з карычневата-вохрыстымі адценнямі. Цацкі маюць традыцыйныя вобразы коніка, козліка, барана, сабакі і г.д. У аснове якіх ляжыць агульная канструкцыя тулава з маленькімі «адросткамі»-ножкамі, і толькі індывідуальнае пластычнае рашэнне верхняй часткі — галоўкі, шыі — надае персанажу новы вобраз. Выявы цацак конікаў маюць тую ж форму самога коніка, толькі розныя самі вершнікі з дэталямі народнай вопраткі мужчынскага або жаночага адзення — капялюша альбо наміткі. Некаторыя калекцыі цацак-свістулек выкананы ў тэхніцы абвару, альбо малачэння. Такія ж культавыя і фальклорныя вытокі мае і цацка-бразготка — першая цацка дзіцяці, якую падвешвалі пад калыскай.



Цацкі-бразготкі, як і цацкі-свістулькі, знаходзяць на многіх паселішчах ранняга жалезнага веку. Па павер'ях, такія цацкі адганялі нячысцікаў. Бразготка — гэта пустацелая гліняная цацка, якая мае форму цыліндрыка альбо шарыка з каменьчыкамі ці глінянымі шарыкамі ўнутры. Калі яе патрэсці, то чуецца глухаваты гук. Але ж калі гліняныя цацкі-свістулькі працягваюць жыць і сёння, бо іх робяць майстры і дзеці ў гуртках, то гліняная бразготка знікла, яе ніхто не лепіць. На змену ёй прыйшлі фабрычныя бразготкі з пластмасы, лёгкія, звонкія, рознакаляровыя. У нашай жа студыі выраб бразготкі ўключаны ў вучэбную праграму. Гэта дазваляе дзіцяці больш грунтоўна засвоіць тэхналагічныя прыёмы лепкі пустацелых вырабаў, асабліва лепкі цацкі ў выглядзе шарыка ці яйка. Валоданне прыёмамі лепкі пустацелых вырабаў у кераміцы з'яўляецца першай тэхналагічнай неабходнасцю. Бразготка можа мець розны «колер» гуку ў залежнасці ад формы, аб'ёму, памеру і колькасці гліняных шарыкаў у ёй. Яе ўпрыгожваюць старажытным лентачна-кропачным арнаментам, салярнымі знакамі. Можна выканаць роспіс ангобам альбо зрабіць «абвар» з частковым пакрыццём палівай. Папулярным у дзіцячай творчасці з'яўляецца і выраб бразготкі ў выглядзе анімалістычнай выявы (пеўніка, коціка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і інш.) з некалькімі шарыкамі ўнутры, што надае творам асаблівы гульнявы напрамак.

Гліняная цацка як від народнага мастацтва стала адметным нацыянальным сувенірам, мастацкім вырабам. Пры гэтым яна захавала сваё практычнае прызначэнне як дзіцячая гульнявая забаўка яшчэ з далёкіх стагоддзяў. Свет цацкі шматвобразны, у ім ужываюцца казка і рэальнасць, сучаснасць і традыцыйнасць. З яе дапамогай дзіця адкрывае сусвет і пазнае накоплены жыццёвы вопыт пакаленняў. Асабліва калі дзіця, хлопчык ці дзяўчынка, само пачынае ствараць цацку.

Значны ўплыў на мяне аказала знаёмства з калекцыяй цацак Мастацка-педагагічнага музея цацкі г. Загорск Маскоўскай вобласці.

Узнікла жаданне працаваць у жанры традыцыйнай цацкі-свістулькі, ствараць новыя формы з сучаснай індывідуальнай трактоўкай пластычнага вобразу. Так з’явілася ў маёй творчасці сюжэтная цацка — цацка-кампазіцыя з некалькімі персанажамі. Яе аснова — выява жывёлы (каровы, барана, казла) пустацелай формы, павялічанага памеру, са свістком і некалькімі адтулінамі, перакрываючы якія можна рэгуляваць гук па вышыні тону, як у акарыны. Да выявы прымацоўваюцца больш мелкія персанажы-свістулькі. Напрыклад, кароўка, на рожках і спіне ў якой прымасціліся пеўнікі-свістулькі, альбо баран з пеўнікамі ці свінка з сям’ю парасяткамі. Такія цацкі маюць большы памер, ствараюць сюжэтную кампазіцыю, прываблівяюць гумарам, вобразнасцю, могуць дапаўняцца рэльефнай дэкаратыўнай аздобай, пакрывацца каляровай палівай альбо дэкарыравацца ў тэхніцы «дымлення», «малачэння». Такія цацкі ствараюць і старэйшыя навучэнцы студыі, а цяпер і іншыя майстры, што можна ўбачыць на конкурсах і фестывалях народнай творчасці.



У 1989—1991 гг. цацкі і дэкаратыўная пластыка навучэнцаў студыі «Скарбонка» і педагога экспанаваліся на ВДНГ СССР. У маёй творчасці з’явіўся і такі напрамак, як фігурная дэкаратыўная пластыка. Фігурныя пасудзіны, дэкаратыўныя скульптуры, скарбонкі, букетнікі і іншыя вырабы ўтылітарна-дэкаратыўнага прызначэння, што калісьці вырабляліся майстрамі Івянца, Ракава і іншых гарадоў, знайшлі прадаўжэнне на Салігорскай зямлі. На працягу многіх гадоў навучэнцы студыі ствараюць дэкаратыўныя пасудзіны, скульптуру з традыцыйнымі анімалістычнымі персанажамі (львамі, мядзведзямі, баранамі і інш.) у тэхніцы ручной лепкі. Выявы больш стылізаваныя, характар формы мае пластычную рэльефную прапрацоўку. Многія творы адзначаны дадатковымі дэталямі, асабістай тэкстурай формы, дэкаратыўна-каляровай гамай палівы. Вобраз мядзведзя — адзін з самых значных у дэкаратыўна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыкладной пластыцы студыі. Ён знайшоў увасабленне і ў скульптурных кампазіцыях «Мядзведзь з птушкамі-свістулькамі», «Выхаванне па-мядзвежы», «Мядзведзь-лайдак» і інш. Значна паўплывала на мой мастацка-стылістычны погляд у гэтым жанры творчасць майстроў старажытнага ганчарнага промыслу фігурнай пластыкі з г. Скапін (Расія), з якімі я сустракаўся на Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Асабліва творчым, пазнавальным і змястоўным было знаёмства з галоўным мастаком Скапінскай мастацкай фабрыкі керамікі Т. Галаванавай.

Сучаснае жыццё патрабуе новых форм і сюжэтаў. Рускі даследчык народнага мастацтва А. Б. Салтыкоў гаварыў, што нельга адасабляцца ад культуры іншых народаў; неабходна творча ўспрымаць і перапрацоўваць, прымяняючы да новых умоў, тое, што ўжо ёсць у мастацтве; нельга разглядаць стыль, які складаўся ў мінулым, як нешта непадпадаючае змяненню, а ўсякі адыход ад яго як адступленне ад народнасці.

Гліняная дэкаратыўная пластыка ў вучэбна-творчым працэсе ў студыі мае вялікае значэнне. Традыцыйныя персанажы, вобразы набываюць у новых кампазіцыях новы, сучасны змест, новую пластычную і дэкаратыўную трактоўку, напаўняюцца дзіцячай непасрэднасцю, жвавасцю, пачуццём радасці. Творы дзяцей часам даюць настаўніку-майстру штуршок да стварэння асабістых работ. Дзіцячая непасрэднасць і прастата неабходны творам майстра.



Многа гадоў назад на фестывалі ў г. Архангельск (Расія), убачыўшы драўляных птушак, зробленых са шчапы, я ўспомніў птушак, якіх рабіла ў маім дзяцінстве бабуля з гліны альбо бульбы. Па прыездзе дадому я зрабіў гліняную птушку. З цягам часу ўдасканаліў яе форму, канструкцыю, прымяніў ангобны роспіс, а пасля і «абвар».

З абварною керамікаю навучэнцы студыі ўпершыню пазнаёміліся ў час экскурсіі ў Клецкі і Нясвіжскі раёны (1987 г.). У Клецкім краязнаўчым музеі ўвагу прыцягнулі два збаночкі з цёмнымі плямкамі рознага памеру па паверхні. Супрацоўніца музея распавядала нам, што на Клетчыне, у вёсках Сіняўка, Ганявічы, Забалотнікі, ганчары выраблялі такі посуд, а цяпер яго няма.

Толькі ў 1990—1991 гг. з прыходам у студыю А. Кірычака адбыліся экспедыцыйныя паездкі на Клетчыну з мэтай знайсці ганчароў, якія маглі б расказаць пра выраб «стракатага» посуду. Доўгія пошукі прывялі нас у в. Ганявічы да Антона Іванавіча Вярэйкі (1912 г.н.), які калісьці займаўся ганчарнай справай. «А цяпер ужо не тыя годы, няма здароўя і патрэбы ў гэтай справе», — сказаў ён. Даведаўшыся, што мы ў гуртку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучаем дзяцей і адраджаем ганчарную справу, майстар вынес з хаты свае вырабы і распавёў пра тэхналогію вырабу гэтага посуду.

Шмат гадоў навучанне ў студыі «Скарбонка» праводзіцца па маёй аўтарскай праграме «Мастацтва народнай керамікі». У народным мастацтве найбольш ёмка адлюстроўваецца ўсё традыцыйнае, нацыянальнае, прыгожае, спрадвечнае, мудрае — тое, што неабходна для выхавання творчай асобы. У народнай і дзіцячай творчасці адзіныя карані: іх яднаюць непасрэднасць, прастата, жвавасць, багацце ўяўлення, пачуцці радасці і святасці.

Асноўнай мэтай праграмы гуртка з'яўляецца выхаванне творчай асобы, павышэнне яе маральнага патэнцыялу, нацыянальнай самасвядомасці, стварэнне спрыяльных умоў для раскрыцця яе здольнасцей і ўменняў.

Асаблівасцю праграмы з'яўляецца тое, што яна складаецца з двух раздзелаў:

1. Традыцыйнае народнае мастацтва керамікі.
2. Сучаснае народнае мастацтва і дэкаратыўная пластыка.



Пры распрацоўцы праграмы ўлічваўся ўзровень развіцця мастацтва керамікі мясцовага рэгіёна, свайго горада. Салігорская школа керамікі маладая, як і горад, але яна ўжо сфарміравалася і развіваецца на лепшых узорах, традыцыях свайго раёна і іншых ганчарных цэнтраў: клецкай «абварной» керамікі, дарасінскіх ганчарных форм, дэкаратыўнай пластыцы Івянца, Ракава. Сёння на Салігорскай зямлі ганчарнаму промыслу прысвяцілі сваё жыццё майстар А. Кірычак (г. Салігорск), самабытны майстар-ганчар Р. Брагін (в. Абідземля). Склалася і развіваецца школа глінянай цацкі, дэкаратыўнай пластыкі, дзе творча працуюць навучэнцы, выпускнікі і кіраўнік студыі «Скарбонка» М. Пратасеня. Сёння Салігорск нельга ўявіць без сучаснай дэкаратыўнай пластыкі майстроў В. Дубовіка і М. Бруя, якая стала брэндам горада. Творы гэтых майстроў можна сустрэць амаль ва ўсіх куточках планеты. Займаецца ганчарным рамяством і ўдзельнічае ў конкурсах народнай творчасці майстар А. Смоліч.

Салігоршчына мае вялікі творчы патэнцыял майстроў-керамістаў, якія працуюць у розных жанрах ганчарнага рамяства, ствараюць мастацтва свайго краю.

Народнае мастацтва заўсёды звязана з жыццём народа, бытам і ўкладам жыцця, але тыя грамадска-палітычныя і эканамічныя пераўтварэнні ў краіне і свеце пагражаюць яму знікненнем. Яно страчвае ўтылітарныя, бытавыя, эканамічныя функцыі, якія раней спрыялі развіццю. Эканамічныя ўмовы, глабальны прамысловы працэс знішчае

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

рукатворнае бытавое прызначэнне народнага мастацтва. Ад гэтага нельга схавацца, спыніць гэты працэс. Але ў народнага мастацтва ёсць вялікая сіла — мастацкасць, якая ў новых умовах у творах майстроў выходзіць на першае месца, пакідаючы ўтылітарна-бытавыя функцыі прамысловай вытворчасці.

У сучасным народным мастацтве выкарыстоўваюцца спрадвечныя матэрыялы, тэхналогіі, працэсы стварэння і адначасова прымяняюцца новыя матэрыялы і спосабы іх апрацоўкі. Так, сумяшчаючы традыцыйнае і сучаснае, з’яўляюцца высокамастацкія творы, якія маюць мастацкую стылізаванасць, вобразнасць, дэкаратыўнасць, асаблівыя мастацка каляровыя рашэнні. З’яўляюцца новыя формы (напрыклад, рэльефныя пано-кампазіцыі з гліны, дрэва, металаў, іншых матэрыялаў), пашыраны рост атрымалі дробная дэкаратыўная скульптура стылізаваных анімалістычных выяў, народных персанажаў, сувеніры рознага характару. Спрадвечныя ганчарныя формы набываюць новыя стылі, складаныя дэкаратыўныя формаўтварэнні і спосабы апрацоўкі. Дэкаратыўнасць, вобразнасць, эмацыянальнасць, пачуццёвасць усё больш і больш характарызуюць сучаснае народнае мастацтва. Сёння майстры, многія з якіх маюць мастацкую адукацыю, кіруюцца не толькі патрэбамі рынку, але і акадэмічнай мастацкай падрыхтоўкай. На жаль, народнае мастацтва выкладалася ў рамках тэорыі, а практыка, у лепшым выпадку, зводзілася да вывучэння тэхналогіі рамяства. Нарадзіўшыся і жывучы ў вялікім горадзе, яны адарваныя ад вёскі і носьбітаў калектыўнага народнага вопыту. 

Народнае мастацтва было для народа часткаю яго матэрыяльнага і духоўнага жыцця, тым асяроддзем, якое склала аснову жыццядзейнасці. Цяпер жа многія яго формы па аб’ектыўных і суб’ектыўных прычынах страчваюць бытавыя, абрадавыя, практычна-ўтылітарныя функцыі і набываюць мастацка-эстэтычную значнасць, становяцца нацыянальным сувенірам. Але ж народнае мастацтва працягвае напаўняць жыццё духоўнасцю, захоўваецца ў памяці пакаленняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ